Забраў тэлефон са сподняга: міліцыя хацела завезці дачку актывісткі ў прытулак

ЕЎРАРАДЫЁ (/AUTHOR/EURARADYYO) | 24/10/2022 - 17:09 | СОЦЫУМ (/CATS/SOCYUM)



Беларуская міліцыя змагаецца з дзецьмі / калаж Улада Рубанава, Еўрарадыё

Пятнаццацігадовая **Аляксандра** — дачка беларускага педагога **Алены Пуцыковіч**. Праз уціск з боку рэжыму Аляксандры давялося ўцякаць з Беларусі. У канцы жніўня ў іх дом у Іванаве заявілася міліцыя і прадстаўніца органаў апекі. Яны прыехалі забраць Аляксандру ў прытулак.

Мама Аляксандры ў Літве. Яна ўпэўненая, што на дачку ціснулі праз яе. У Беларусі за пратэставую актыўнасць Алену пакаралі хатняй хіміяй. Была рызыка, што "хімію" зменяць на калонію. Тады жанчына адважылася ўцякаць за мяжу. У Беларусі засталіся бацька і бабуля Аляксандры, але міліцыі было дастаткова "палітычнага" артыкула мамы, каб прыехаць па дзіця.



(/sites/default/files/styles/default_image_paragraph/public/paragraphs/image/dismissedteacher_b.png.webp?itok=Ost1MNAG)

Алена Пуцыковіч / фота з сацыяльных сетак

"Зараз забяром цябе ў прытулак"

— Я знаходзілася дома адна. Пачула, як гаўкае сабака. Потым вельмі моцна загрукалі ў дзверы. Давялося адчыніць, — расказвае Аляксандра.

За дзвярыма стаяў міліцыянер **Святаслаў Дзімакоў**, яшчэ адна супрацоўніца міліцыі і дырэктар мясцовага прытулку. Размаўляў з Аляксандрай Дзімакоў.

— Ён сказаў: "Зачыні сабаку ў пакоі, або яна апынецца ў лякарні". Я папрасіла выйсці, бо мне некамфортна, калі чужыя людзі ў мяне дома. Ён сказаў: "Ты мне не ўказвай, я буду рабіць тое, што я лічу патрэбным". Пасля чаго пачаўся допыт, маўляў, дзе тата? Я сказала, што паехаў па справах. Мне сказалі: "Зараз забяром цябе ў прытулак".

Падставай было тое, што Аляксандра нібыта знаходзіцца без нагляду.

— Я ведаю, што калі нехта з бацькоў знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі і можа прыехаць на працягу сутак, то я магу знаходзіцца без папер і дакументаў пад апекай бабулі. На што яны сказалі: "Тэлефануй бабулі".

"Вельмі борзая для сваіх пятнаццаці гадоў"

Пакуль бабуля ехала да Аляксандры, дзяўчыну распытвалі пра маму, патрабавалі паказаць тэлефон.

*— Я не хацела даваць тэлефон, сказала, што ў мяне адзін ужо забралі. Ён кажа: "Я зараз і гэты забяру". Былі пагрозы, што я паеду ў аддзяленне міліцыі. Пасля размовы з бабуляй я прыбрала тэлефон за спіну, то-бок у споднюю бялізну. І села на прыступцы. Ён мне кажа: "Ты наогул вельмі борзая для сваіх пятнаццаці гадоў, п*здзючка малалетняя".*

Ён схапіў мяне за дзве рукі, вельмі моцна сціснуў, падняў сілай і дастаў тэлефон са сподняй бялізны. Я лічу, гэта ненармальна. Тэлефон выпаў на прыступку, і я не заўважыла, як села на яго. Ён зноў пачаў падымаць мяне сілай. Скруціў рукі, я супраціўлялася. Тэлефон ён у мяне адабраў і вельмі моцна ўдарыў па галаве. Колькі часу ў мяне вуха дрэнна чула, — расказвае Аляксандра.



(/sites/default/files/styles/default_image_paragraph/public/paragraphs/image/1_49.png.webp?itok=wgSHBz11)

Фота Дзімакова, якое зрабіў тэлефон Аляксандры пры ўводзе няправільнага пароля / Еўрарадыё

Дзімакоў не змог зайсці ў запароленыя сацсеткі Аляксандры, таму пагражаў разбіць тэлефон, а потым шпурнуў яго ў дзяўчыну. Жанчыны — дырэктарка прытулку і супрацоўніца міліцыі — проста назіралі і не ўмешваліся, адзначае школьніца.

Потым прыехала бабуля Аляксандры, аднак на гэтым гісторыя не скончылася. Пасля таго, што здарылася, дзяўчына трапіла ў лякарню.

— *Выявіліся прыкметы страсення мозга: галавакружэнне, млоснасць, ваніты. Давялося выклікаць хуткую,* — расказвае Алена пра стан дачкі. — *Усё гэта на фоне моцнага стрэсу. Маё дзіця ніколі з такім не сутыкалася. Людзі, якія павінны абараніць яе, прыйшлі для таго, каб збіць яе!*

Прыйшлі ноччу ў палату

У лякарні Аляксандру таксама не пакінулі ў спакоі.

— *Пасля дванаццаці гадзін ночы Дзімакоў у цывільным адзенні і чалавек у швэдры з надпісам "Следчы камітэт" прыйшлі да яе ў палату ўдвух. Больш не было ніводнага дарослага. Яны хацелі запалохаць яе і прымусіць даваць паказанні. Яна адмовілася што-небудзь гаварыць без прысутнасці бацькі. Яны пайшлі, але паехалі да бабулі, якой ужо семдзесят пяць гадоў.*

Ад настаўніцы да беспрацоўнай праз суд за "абразу" міліцыянераў

(https://euroradio.fm/ad-nastaunicy-da-bespracounay-praz-sud-za-abrazu-milicyyanerau)

Так ахоўваецца дзяцінства ў Беларусі. Мая дачка — выдатніца, пераможца раённых алімпіяд па многіх прадметах. І тут прыходзяць дадому ў вячэрні час яе зневажаць, абражаць, збіваць.

Аднак перш за ўсё сілавікоў цікавіла Алена.

— Я перадала ў міліцыю свой нумар мабільнага тэлефона для сувязі. Літаральна адразу ж мне патэлефанавалі з крымінальнага вышуку Іванаўскага РАУС і запатрабавалі распіску з фота ў Літве.

Нібыта тады будзе вядома, дзе яна, і жанчыну здымуць з вышуку ў Беларусі.

— Тэлефанавалі кожны дзень, настойліва патрабуючы, што ім трэба. Я адказала, што ў іх шэрагах злачынцы і пакуль Дзімакоў носіць пагоны, ніякага дыялогу не будзе.

Сям'і праверкі, а міліцыя "дзейнічала па законе"



(/sites/default/files/styles/default_image_paragraph/public/paragraphs/image/2_167.jpg.webp?itok=QU_HYqA-)

У 2022 годзе Дзімакоў (другі злева) перайшоў у крымінальны вышук / janow.by

Пасля інцыдэнту Аляксандра і яе бацька напісалі скаргі ў РАУС і пракуратуру. Яшчэ бацька напісаў заяву ў СК з патрабаваннем даць ацэнку дзеянням супрацоўнікаў міліцыі.

— *Адказы* [ёсць у распараджэнні рэдакцыі. — Еўрарадыё] *былі прадказальныя — "выконваў, не перавышаў, дзейнічаў" па законе,* — кажа Алена.

Тыдзень Аляксандра правяла ў траўматалагічным аддзяленні, а 8 верасня прайшла медыцынскі агляд у судмедэкспертызе Пінска.

— Сінякі былі на руцэ, на спіне, на твары. Спецыяліст, якому Дачка паказвала сінякі, адказаў, што на твары сінякоў не бачыць. У пачатку кастрычніка прыйшоў адказ з СК, што разгляд справы прыпынены "ў сувязі з неатрыманнем заключэння ... судова-медыцынскай экспертызы".

У аддзел адукацыі Іванаўскага райвыканкама быў накіраваны ліст з РАУС з патрабаваннем вывучыць становішча ў сям'і.

Збіццё, катаванні, пагрозы і пагромы. Як сілавікі "зачышчалі" Іванава

— Прыходзілі са школы, з СПЦ, санстанцыя, МНС, з міліцыі. У заключэнні было сказана, што ўмовы пражывання здавальняючыя, Бацька забяспечвае ўсім неабходным. 21 верасня ў гімназіі, у якой вучылася наша дачка, адбылося пасяджэнне савета па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў.

(https://euroradio.fm/zbiccyo-katavanni-pagrozy-i-pagromy-yak-silaviki-zachyshchali-ivanava)

Там бацьку Аляксандры парэкамендавалі змяніць працу.

— Крэатыўнасць былых калег, кожную з якіх я ведаю асабіста, пацешыла. Адсутнасць прававой абароны, сітуацыі, з якімі давялося сутыкнуцца маёй дачцэ, не пакінулі іншых варыянтаў, акрамя як пакінуць краіну, з'ехаўшы ў дэмакратычную дзяржаву, дзе яна будзе жыць і вучыцца ў бяспецы, — кажа на заканчэнне Алена.

Пра Дзімакова, праз якога падлетку давялося ўцякаць з краіны, мы знайшлі хвалебны артыкул (http://www.janow.by/gazeta-yana-ski-kraj/nashi-rubriki/obshchestvo/zaschitnik-sovetchik-i-psiholog) ад 2017 года з назвай "Абаронца, дарадца і псіхолаг".

Каб сачыць за галоўнымі навінамі, падпішыцеся на канал Еўрарадыё ў Telegram (https://t.me/euroradio).

Мы штодня публікуем відэа пра жыццё ў Беларусі на Youtube-канале. Падпісацца можна тут (https://www.youtube.com/channel/UC1v_dekbxqgQjBQ2fg39uBg?sub_confirmation=1).

prytulak&title=%D0%97%D0%B0%D0%B1%D1%80%D0%B0%D1%9E%20%D1%82%D1%8D%D0%BB%D0%B5%D1%84%D0%BE%D0%BD%20%D1%81%D0%B0%20%D1%81%
(/#vk) (/#twitter) (/#facebook)

Tags

Сілавыя структуры (/silavyya-struktury) Міліцыя ў Беларусі (/milicyya-u-belarusi) Дзеці (/dzeci)
Гвалт з боку сілавікоў (/gvalt-z-boku-silavikou) Рэпрэсіі ў Беларусі (/represii-u-belarusi)



(/supracouniki-kdb-zmoguc-skladac-pratakoly-pavodle-pratestnykh-artykulau)

Супрацоўнікі КДБ змогуць складаць пратаколы паводле пратэсных артыкулаў (/supracouniki-kdb-zmoguc-skladac-pratakoly-pavodle-pratestnykh-artykulau)

9:21 22.12.2023



(/magilyoucu-yaki-vyarnuusya-z-polshchy-dadali-pautara-goda-znyavolennya)

Магілёўцу, які вярнуўся з Польшчы, дадалі паўтара года зняволення (/magilyoucu-yaki-vyarnuusya-z-polshchy-dadali-pautara-goda-znyavolennya)

11:20 22.12.2023



(/pra-pospekhi-rascharavanni-skandaly-i-vyniki-goda-efir-z-cikhanouskay)

(/eu[illegible])года — эфір з Ціханоўскай (/pra-pospekhi-rascharavanni-skandaly-i-vyniki-goda-efir-z-cikhanouskay)

11:32 22.12.2023

(/eu[illegible]) да пачатку выбараў — эфір (/gulni-vakol-kr-try-galasy-kvoty-i-raskol-da-pachatku-vybarau-efir)

7:57 22.12.2023

Сілавікі затрымалі за "экстрэмізм" столяра і муляра з "Гроднажылбуда" (/silaviki-zatrymali-za-ekstremizm-stolyara-i-mulyara-z-grodnazhylbuda)

6:37 22.12.2023

Пастара царквы "Новае жыццё" выклікалі ў Следчы камітэт (/pastara-carkvy-novae-zhyccyo-vyklikali-u-sledchy-kamitet)

7:51 22.12.2023

У Латвіі хочуць стварыць міжнародны цэнтр па вяртанні вывезеных з Украіны дзяцей (/u-latvii-khochuc-stvaryc-mizhnarodny-centr-dlya-vyartannya-vyvezenykh-ukrainskikh-dzyac)

15:06 21.12.2023

За ўдзел у пратэстах затрымалі дырэктараў курсаў па польскай мове (/za-udzel-u-pratestakh-zatrymali-dyrektarau-kursau-pa-polskay-move)

16:06 21.12.2023

Атрад спецназу заўважылі ў закінутым дзіцячым летніку пад Гомелем (/atrad-specnazu-zauvazhyli-u-zakinutym-dzicyachym-letniku-pad-gomelem)

16:41 21.12.2023

Апошнія навіны

(/eu[illegible])года — эфір з Ціханоўскай (/pra-pospekhi-rascharavanni-skandaly-i-vyniki-goda-efir-z-

cikhanouskay)

(/eurorado_ajax_elem_enf/1240304/extern_wider)

Лукашэнка сіпіць, а БНБК просіць грошай ад Стрым з Кныровічам (/lukashenka-sipic-bnbk-prosic-groshay-strym-z-knyrovicham)

(/eurorado_ajax_elem_enf/1240291/extern_wider)

Прывід выбараў на фоне вайны, рэпрэсій і “павышэння даверу да КДБ” — эфір (/pryvid-vybarau-na-fone-vayny-represiy-i-pavyshennya-daveru-da-kdb-efir)

14:47 (/eurorado_ajax_elem_enf/1240307/extern_wider)

Штодзіо Zoltan перавёў да патопаў і разбурэнняў на поўначы Германіі (/shtorm-zoltan-pryvyou-da-patopau-i-razburennyau-na-pounachy-germanii)

14:20 Магілёўцу, які вярнуўся з Польшчы, дадалі паўтара года зняволення (/magilyoucu-yaki-vyarnuusya-z-polshchy-dadali-pautara-goda-znyavolennya)

больш навіна

Галоўнае



(/pryvid-vybarau-na-fone-vayny-represiy-i-pavyshennya-daveru-da-kdb-efir)

Прывід выбараў на фоне вайны, рэпрэсій і “павышэння даверу да КДБ” — эфір (/pryvid-vybarau-na-fone-vayny-represiy-i-pavyshennya-daveru-da-kdb-efir)



(/lukashenka-sipic-bnbk-prosic-groshay-strym-z-knyrovicham)

Лукашэнка сіпіць, а БНБК просіць грошай. Стрым з Кныровічам (/lukashenka-sipic-bnbk-prosic-groshay-strym-z-knyrovicham)



(/gulni-vakol-kr-try-galasy-kvoty-i-raskol-da-pachatku-vybarau-efir)

Гульні вакол КР: "тры галасы", квоты і раскол да пачатку выбараў — эфір (/gulni-vakol-kr-try-galasy-kvoty-i-raskol-da-pachatku-vybarau-efir)



(/belaruska-u-praze-upershynyu-za-2-gady-napisala-mame-kab-skazac-shto-zhyvaya)

Беларуска ў Празе: упершыню за 2 гады патэліла маме, каб сказаць, што жывая (/belaruska-u-praze-upershynyu-za-2-gady-napisala-mame-kab-skazac-shto-zhyvaya)

Выбар рэдакцыі



(/belaruski-stendap-u-2023-godze-shto-paglyadzec)

(/euroradio_ajax_element/1240278/external_video)
Беларускі стэндап у 2023 годзе: што паглядзець (/belaruski-stendap-u-2023-godze-shto-paglyadzec)



(/chym-adznachylisya-talenavityya-maladyya-navukoucy-yakikh-zaakhvociu-lukashenka)

Чым адзначыліся "таленавітыя маладыя навукоўцы", якіх заахвоціў Лукашэнка? (/chym-adznachylisya-talenavityya-maladyya-navukoucy-yakikh-zaakhvociu-lukashenka)

СОЦЫУМ (/CATS/SOCYUM)

ПАЛІТЫКА (/CATS/PALITYKA)



(/magilyoucu-yaki-vyarnuusya-z-polshchy-dadali-pautara-goda-znyavolennya)

ЭКАНОМІКА (/CATS/EKANOMIKA)

Магілёўцу, які вярнуўся з Польшчы, дадалі паўтара года зняволення (/magilyoucu-yaki-vyarnuusya-z-polshchy-dadali-pautara-goda-znyavolennya)



(/pra-pospekhi-rascharavanni-skandaly-i-vyniki-goda-efir-z-cikhanouskay)

КУЛЬТУРА (/CATS/KULTURA)

Пра поспехі, расчараванні, скандалы і вынікі года — эфір з Ціханоўскай (/pra-pospekhi-rascharavanni-skandaly-i-vyniki-goda-efir-z-cikhanouskay)



(/belarus-pastaulyae-u-rasiyu-peraupakavanuyu-francuzskuyu-rybu-rasselgasnaglyad)

Беларусь пастаўляе ў Расію пераўпакаваную французскую рыбу — Рассельгаснагляд (/belarus-pastaulyae-u-rasiyu-peraupakavanuyu-francuzskuyu-rybu-rasselgasnaglyad)

13:58 22.12.2023



(/belaruski-stendap-u-2023-godze-shto-paglyadzec)

Беларускі стэндап у 2023 годзе: што паглядзець (/belaruski-stendap-u-2023-godze-shto-paglyadzec)

18:[illegible]2.2023

СПОРТ (/CATS/SPORT)



(/u-presbola-zyaviusya-novy-galouny-redaktar)

У "Прэсбола" з'явіўся новы галоўны рэдактар (/u-presbola-zyaviusya-novy-galouny-redaktar)

11:49 22.12.2023

Беларускія коннікі не змогуць выступіць на АЛімпіядзе 2024 года (/belaruskiya-konniki-ne-zhnogue-vystupicha-na-alimpiyadze-2024-godu)

8:18 22.12.2023

МУЗЫКА (/CATS/MUZYKA)

У [illegible]кай кватэры Святланы Алексіевіч [illegible] нобелеўскага



(/pa[illegible]-zasnavalnik-pogues-irlandski-muzyka-sheyn-makgouen)

Памер заснавальніка The Pogues, ірландскі музыка Шэйн Макгоўэн (/pa[illegible]yor-zasnavalnik-pogues-irlandski-muzyka-sheyn-makgouen)

16:31 30.11.2023

У Беларусі прызначаны [illegible] Вольскага (/u-[illegible]-zasnavalnik-pogues-irlandski-muzyka-sheyn-makgouen)

Стрым Еўрарадыё

Сапраўдны ўсё-ж-ды ў Рэчы Пашчасцяў

ПАВЕДАМІ НАВІНУ!

(/forma/pavedamic-navinu)

